Нашы землякі

# Герой Савецкага Саюза Якаў Сусько

Шмат ратных подзвігаў здзейсніў у час Вялікай Айчыннай вайны наш зямляк Сусько Якаў Ягоравіч.

За баявыя заслугі па выкананню заданняў камандавання яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем медаля Залатая Зорка і ордэна Леніна.

Група самалётаў-штурмавікоў «ІЛ-12» пад камандаваннем т. Сусько рабіла налёты на аэрадромы, скапленні жывой сілы і тэхнікі нямецка - фашысцкіх войск. Вясной 1943 года савецкія штурмавікі нанеслі адчувальны ўдар па нямецкаму аэрадрому «Сешча». Было знішчана каля 30 бамбардзіроўшчыкаў. Неўзабаве савецкія «Ілы» выявілі і знішчылі два бронепаязды непрыяцеля.

Фронт адсоўваўся на захад. У бесперапынных атаках і налётах на непрыяцеля праводзілі дні і ночы бясстрашныя савецкія штурмавікі. У 1944 годзе падраздзяленне Сусько зрабіла дзёрзкі налёт на нямецкі аэрадром каля горада Станіслававa (цяпер горад Іван Франко). 38 знішчаных фашысцкіх самалётаў — такі рахунак гэтай аперацыі авіяцыйнага падраздзялення.

У любых баях і атаках камуніст Сусько заўсёды быў уперадзе, паказаў прыклады бясстрашша, адвагі і знаходлівасці. Ён не раз глядзеў смерці ў вочы. Шэсць разоў збівалі яго фашысцкія сцярвятнікі. Прыходзілася выкідвацца з машыны на парашуце, садзіць падбіты самалёт у непрыстасаваных для пасадкі месцах—у гарах, у лесе, на засеяным полі і г. д.

Але як бы ні здаралася, лётчык-штурмавік заўсёды прызямляўся на сваёй паласе. У гэтым яму дапамагала кемлівасць, вынослівасць, выручка баявых сяброў.

Я. Я. Сусько нарадзіўся ў 1917 годзе ў вёсцы Чарняўка Хоцімскага пасялковага Савета. Пасля заканчэння сямігодкі паступіў у школу фабрычна-заводскага навучання ў Ленінградзе. З 1934 па 1937 гг. працаваў кавалём і слесарам на Ленінградскім металічным заводзе.



Я. Я. СУСЬКО.

У 1937 годзе па пуцёўцы камсамола быў накіраваны ў лётную школу, якую закончыў напярэдадні вайны.

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны Я. Я. Сусько ўдзельнічаў у баях на розных франтах, камандаваў эскадрылляй штурмавікоў, зрабіў каля двухсот баявых вылетаў.

Пасля вайны дэмабілізаваўся па стану здароўя і пераехаў жыць у Варонеж. Тут ён закончыў двухгадовую партыйную школу і педагагічны інстытут. Пасля працаваў лектарам Варонежскага абкома КПСС.

У 1952 годзе Я. Я. Сусько закончыў Вышэйшую дыпламатычную школу. З гэтага часу ён знаходзіцца на дыпламатычнай рабоце.

**М. БУТЭЛІН.**

Тыраж 6.807 экз. Друкарня газеты „Сцяг камунізма". Заказ № 293.

Бутэлін, М. Герой Савецкага Саюза Якаў Сусько / Н. Бутэлін // Сцяг камунізма. — 1964. — 18 жніўня. — С. 4.